<table>
<tr><th>Дзеянні</th><th>Вынік</th></tr>
<tr><td>На слайды 3–10 уставіць кнопку кіравання Домой , якая будзе служыць спасылкай на слайд са зместам (для ўстаўкі карыстацца меню кнопкі , раздзел Управляющие кнопки).</td><td></td></tr>
</table>

Захавайце змяненні ў прэзентацыі.

**4*** Дадайце да прэзентацыі гук з файла, падрыхтаванага настаўнікам. Праслухайце гук. Устанавіце параметры прайгравання так, каб гук суправаджаў паказ прэзентацыі. Захавайце змяненні ў прэзентацыі.

**5*** Дадайце да прэзентацыі відэа з файла. Прагледзьце відэа. Захавайце змяненні ў прэзентацыі.

# § 15. Настройка прэзентацыі

## 15.1. Настройка анімацыі аб’ектаў

Да аб’ектаў, размешчаных на слайдзе, можна прымяняць эфекты анімацыі. Анімацыя дазваляе прыцягнуць увагу да найбольш важнай інфармацыі на слайдзе.

У PowerPoint ёсць некалькі тыпаў анімацыйных эфектаў:

- эфекты ўваходу;
- эфекты вылучэння;
- эфекты выхаду;
- эфекты шляхоў перамяшчэння.

(Разгледзьце прыклад 15.1.)

**Прыклад 15.1.** Эфекты анімацыі.



Тыпы анімацыйных эфектаў вызначаюць, як будзе з'яўляцца, вылучацца, знікаць або перамяшчацца аб'ект.

Для дабаўлення эфекту анімацыі да аб'екта неабходна выканаць наступныя дзеянні:

1. Адкрыць укладку **Анимация.**
2. Выбраць аб'ект на слайдзе.
3. Дадаць да яго анімацыю (прыклад 15.2).
4. Настроіць параметры анімацыі (прыклад 15.3):

- змяніць параметры эфекту;
- вызначыць спосаб кіравання эфектам: па пстрычцы ці па часе;
- змяніць парадак анімацыі (калі неабходна).

Для настройкі анімацыі выкарыстоўваецца **Область анимации,** на якой прадстаўлены ўсе эфекты анімацыі, дабаўленыя да аб'ектаў на слайдзе (прыклад 15.4).

Нумар перад назвай аб'екта паказвае парадак анімацыі аб'екта. Калі побач з аб'ектам намалявана мыш, то эфект адбываецца па пстрычцы мышы, а калі гадзіннік — то па часе.

Каляровыя прамавугольнікі справа ад назвы аб'екта вызначаюць тып эфекту анімацыі. Зялёны

Пад *анімацыяй* разумеюць тэхналогію, якая стварае ілюзію руху аб'ектаў.

**Прыклад 15.2.** Дабаўленне анімацыі да аб'екта.




**Прыклад 15.3.** Кіраванне параметрамі анімацыі.




**Прыклад 15.4.** Вобласць анімацыі.




Правообладатель Народная асвета

прамавугольнік азначае ўваход, блакітны — перамяшчэнне, жоўты — вылучэнне, чырвоны — выхад.

Кіраваць аб’ектамі ў вобласці анімацыі можна з дапамогай кантэкставага меню (прыклад 15.05).

Парадак з’яўлення аб’ектаў на слайдзе рэгулююць з дапамогай эфектаў уваходу і выхаду. Напрыклад, спачатку да аб’екта прымяняецца эфект **Вход**, некаторы час аб’ект застаецца на слайдзе, затым да яго прымяняецца эфект **Выход** — аб’ект знікае.

## 15.2. Змена слайдаў

Для змены слайдаў у PowerPoint прадугледжаны розныя эфекты. Увесь пералік эфектаў прадстаўлены на ўкладцы **Пераходы.**

Выбраны эфект можна адразу ж прагледзець (прыклад 15.6). Параметры многіх эфектаў прадугледжваюць настройку (прыклад 15.7).

Пры неабходнасці да эфекту можна дадаць гук. Калі эфект спадабаўся, яго можна прымяніць да ўсіх слайдаў (прыклад 15.8).

Праграма PowerPoint дае дзве магчымасці настройкі змены слайдаў: па пстрычцы мышы і па заканчэнні некаторага часу.

**Прыклад 15.5.** Кантэкставае меню аб’екта ў Вобласці анімацыі.




**Прыклад 15.6.** Прымяненне эфекту **Растворение** да слайда.






**Прыклад 15.7.** Выбар параметра для эфекту **Сдвиг**.



Па змоўчанні ўстаноўлены рэжым па пстрычцы мышы, таму, калі не змяняць ніякіх настроек, новы слайд будзе з'яўляцца пасля пстрычкі мышы. Калі змена слайдаў павінна адбывацца па часе, то неабходна задаць час, па заканчэнні якога слайд замяніцца іншым (прыклад 15.9).

Існуюць дадатковыя магчымасці настройкі часу змены неабходных слайдаў.

## 15.3. Асноўныя патрабаванні да камп'ютарнай прэзентацыі

Не існуе адзіных правіл стварэння мультымедыйных прэзентацый. Аднак некаторыя рэкамендацыі дапамогуць вам зрабіць прэзентацыю лепшай.

Пры падрыхтоўцы прэзентацыі трэба прадумаць яе мэту і змест, структуру і дызайн (прыклад 15.10), правесці рэпетыцыю выступлення з прэзентацыяй.

У першую чаргу неабходна зразумець, для чаго вам патрэбна прэзентацыя. Яе змест заўсёды падбіраецца з улікам аўдыторыі, для якой рыхтуецца выступленне (прыклад 15.11).

Пры падборы мультымедыйных аб'ектаў для слайдаў трэба памятаць, што:

**Прыклад 15.8.** Прымяненне эфекту пераходу да ўсіх слайдаў.




**Прыклад 15.9.** Устаноўка параметраў часу.




**Прыклад 15.10.** Апорны канспект па стварэнні прэзентацыі.




**Прыклад 15.11.** Патрабаванні да прэзентацыі.

- Форма і падача інфармацыі павінны адпавядаць узросту, інтарэсам і стылю жыцця аўдыторыі.
- Павінна прасочвацца сюжэтная лінія: *цікавы факт* → *пастаноўка праблемы* → *магчымае рашэнне*.
- Інфармацыя павінна падавацца проста і даступна.

Правообладатель Народная асвета

**Прыклад 15.12.** Рэкамендацыі па дызайне прэзентацыі.

- Для ўсіх слайдаў прымяняецца адзінае стылявое афармленне.
- Колеры павінны гарманічна дапаўняць адзін аднаго. Ва ўбудаваных тэмах колеры падабраны дызайнерамі, таму лепш прытрымлівацца гатовых тэм.
- Лепш выкарыстоўваць не больш за тры шрыфты (першы для загалоўкаў, другі для асноўнага тэксту, трэці для тлумачэнняў, калі яны ёсць).
- Памер шрыфту асноўнага тэксту павінен быць такім, каб яго можна было лёгка прачытаць, паменшыўшы памер слайда да 30 %. Часцей за ўсё выкарыстоўваюцца шрыфты памеру 24–26.
- Колеравая палітра малюнкаў, якія выкарыстоўваюцца для візуальных акцэнтаў, павінна адпавядаць колераваму дызайну слайдаў.

Для змянення колеравай палітры малюнка трэба вылучыць малюнак, перайсці на ўкладку **Формат рисунка** і настроіць колер з дапамогай інструмента Цвет ⌄.

- інфармацыя разбіваецца на часткі паводле правіла: «адна думка — адзін слайд»;
- графічныя элементы ўспрымаюцца лепш за тэкставыя;
- пажадана наяўнасць на слайдзе двух блокаў з інфармацыяй рознага віду (тэкст, відарысы), якія дапаўняюць адзін аднаго;
- сярэдняя колькасць слоў на слайдзе — 25;
- анімацыя аб'ектаў павінна дапамагаць успрыманню інфармацыі, не выкарыстоўвайце анімацыю дзеля самой анімацыі;
- гукавое суправаджэнне дарэчы толькі для невялікіх аўдыторый.

Дызайн прэзентацый павінен быць прадуманы (прыклад 15.12).

Прагляд створанай прэзентацыі дазволіць убачыць, наколькі ўдала падабраны і размешчаны матэрыял, як ажыццяўляецца змена слайдаў, наколькі дарэчная анімацыя аб'ектаў і гук. Падчас рэпетыцыі можна вызначыць час дэманстрацыі прэзентацыі і пры неабходнасці змяніць яго.

?

**1.** Якія тыпы эфектаў анімацыі можна прымяніць да аб'ектаў у PowerPoint?
**2.** У чым адрозненне эфектаў анімацыі групы **Вход** ад эфектаў анімацыі групы **Выход**?
**3.** Якія магчымасці для змены слайдаў ёсць у PowerPoint?
**4.** Як можна настроіць час змены слайдаў?

**5.** Якіх рэкамендацый трэба прытрымлівацца пры размяшчэнні аб'ектаў на слайдах?

**6.** Якіх рэкамендацый трэба прытрымлівацца пры выбары дызайну слайда?

## Практыкаванні

**1** Загрузіце файл з прэзентацыяй «Искусство», захаваны пасля выканання задання 2 з практыкавання да § 14 (с. 112–113). Выканайце заданні.

1) Дадайце на слайды 3–6 эфект анімацыі да відарысаў карцін. Параметры эфекту: **вход → масштабирование, начало → после предыдущего, продолжительность → средняя.**

2) Устаўце слайд 7 і змясціце на ім тэкст «Искусство может переживать времена упадка, но оно вечно, как сама жизнь. Федор Иванович Шаляпин».

3) Прымяніце да тэксту слайда 7 эфект анімацыі. Параметры эфекту: **выход → часовая стрелка, начало → после предыдущего.**

**2** Настройце змену слайдаў прэзентацыі. Эфект: **Панорама.** Параметры эфекту: **по вертикали наружу.**

**3** Дадайце на слайд 1 гук з файла, падрыхтаванага настаўнікам.

**4** Устаўце перад апошнім слайдам новы слайд. Дадайце на яго ўбудаваны відэазапіс, падрыхтаваны настаўнікам.

**5** Дапоўніце прэзентацыі, падрыхтаваныя настаўнікам па тэмах вучэбных прадметаў:

1. Беларуская літаратура. Міфы славян.
2. Мастацтва. «Вечныя» тэмы ў мастацтве.

**6*** Стварыце прэзентацыі па тэмах:

1. Абавязкі дзяжурнага па класе.
2. Сямейныя святы.
3. Геаграфія. Прырода Зямлі.
4. Сусветная гісторыя. Позняе Сярэднявечча.
5. Гісторыя Беларусі. Культура беларускіх зямель у Высокім Сярэднявеччы.
6. Матэматыка. Мноствы.
7. Біялогія. Разнастайнасць жывых арганізмаў.

Правообладатель Народная асвета